На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб Колас

№ 76 (198)

Субота, 3 мая 1997 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г. на беларускай і рускай мовах
Перыядычнасць — 5 разоў у тыдзень
Выдавец — ТАА "Народная воля"
Кошт: у кіёсках і крамах — 2000 руб., у індывідуальных гандляроў — свабодны.

Народная Воля

Сонца

	Усход	Захад
Віцебск	5.15	20.38
Магілёў	5.19	20.33
Гомель	5.22	20.25
Мінск	5.30	20.43
Гродна	5.46	20.58
Брэст	5.52	20.53

Ведаеце?

Цяпер Беларусь мае сваё "Яблоко"

Палітычная палітра Беларусі ў самым канцы красавіка прыкметна папышралася — у Мінску прайшоў устаноўчы з'езд беларускага грамадскага аб'яднання "Яблоко".

Адкрываючы яго, старшыня аргкамітэту па правядзенню з'езда, дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання Вольга Абрамава адзначыла, што беларускае "Яблоко" — гэта не палітычная партыя, а толькі грамадскае аб'яднанне; па-другое, яно — не філіял расійскага "Яблока", а самастойная арганізацыя, якая бярэ за аснову суверэнітэт Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, Вольга Абрамава адзначыла, што беларускае "Яблоко" выступае за інтэграцыю з Расіяй, але з'яўляецца праціўнікам палітыкі Аляксандра Лукашэнкі, лічачы яго дыктатарам. Да таго ж яно заклікана разбурыць двухпалюснасць беларускай палітыкі. Аб'яднанне лічыць, што сутнасць руху Беларусі да дэмакратыі і эфектыўнай эканомікі заключаецца ў спалучэнні ліберальнага і сацыяльнага падыходу да вырашэння ўсіх грамадскіх задач.

Выступіўшы з 30-хвілінный прамовай, госць з'езда, дэпутат Дзяржаўнай Думы Расіі Рыгор Яўлінскі, таксама заявіў аб тым, што расійскае "Яблоко" не пярэчыць супраць таго, каб беларускія аднадумцы ўваходзілі ў яго склад. Больш таго, па словах Р.Яўлінскага, ён вельмі хацеў бы, каб наступны з'езд беларускай арганізацыі "Яблоко" праводзіўся на беларускай мове.

Асобна спыніўшыся на праблеме стварэння Саюза Беларусі і Расіі, маскоўскі госць сфармуляваў наступную формулу для гэтага Саюза: палітычная незалежнасць Расіі і Беларусі плюс эканамічная інтэграцыя дзвюх дзяржаў. Тое, што сёння праводзіцца кіраўнікамі Беларусі і Расіі, на думку расійскага парламентарыя, з'яўляецца спробай падмяніць грамадскасць дзвюх дзяржаў "палітычнай трэскатнёй". Рыгор Аляксеевіч падкрэсліў, што трэба вырашаць перш за ўсё эканамічныя задачы, і нагадаў прысутным, што Еўропа рухалася да сваёй інтэграцыі каля сарака гадоў. Урэшце, як перакананы Р.Яўлінскі, Беларусь і Расія могуць прыйсці да інтэграцыі за больш кароткі тэрмін, але "наскокам такое пытанне ніколі не вырашыць".

Дарэчы, госць з суседняй дзяржавы паведаміў удзельнікам з'езда пра тое, што напярэдадні свайго ад'езду з Масквы ён атрымаў ліст за подпісам кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Міхаіла Мясніковіча. Пасля дзяжурных слоў падзякі за ўвагу да праекта Статута новага Саюза [illegible] га залатога запасу Расіі і Беларусі (у залежнасці ад памеру ўклада ў гэты фонд кожнай краіне налічваецца тая ці іншая колькасць галасоў пры вырашэнні эканамічных пытанняў) называецца абсалютна непрымальнай для Беларусі. М.Мясніковіч сцвярджае, што дамоўленасці можна будзе падпісваць толькі ў тым выпадку, калі будзе дзейнічаць прынцып: адна краіна — адзін голас.

Паводле звестак мандатнай камісіі ўстаноўчага з'езда аб'яднання і прафесійных занятках дэлегатаў, можна прыйсці да такой высновы — гэта будзе форум беларускай інтэлігенцыі.

Кіраўніком беларускага "Яблока" абраная Вольга Абрамава. Зацверджаны Статут, базавыя прынцыпы, эканамічная платформа аб'яднання. Прысутнічаўшы на з'ездзе дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання П.Краўчанка адзначыў, што стварэнне новай арганізацыі — "гэта не разбурэнне, а, наадварот, умацаванне дэмакратыі. Мы ўсё больш і больш набліжаемся да Еўропы".

Уладзімір ГЛОД.

3 мая — Всемирный день свободы печати

Без свободного слова демократия невозможна

3 мая нынешнего года мы отмечаем Всемирный день свободы печати на грустном фоне непрекращающихся посягательств на свободу выражения мнений. В 1996 году многие журналисты, фотографы, операторы и другие профессиональные работники средств информации снова подвергались запугиванию и преследованиям. Многие из них незаконно арестовывались, похищались или подвергались угрозам физического насилия. Во многих странах право на свободу выражения мнений нарушалось цензурой, производились изъятия материалов и увольнения.

Неправительственные организации, которые повсюду в мире стремятся укрепить свободу печати, отметили в 1996 году от сорока до пятидесяти случаев убийств журналистов и других работников средств информации при исполнении ими своих профессиональных обязанностей. Конечно, в 1995 году число жертв было еще большим, однако их уменьшение остается довольно относительным; кроме того, появляются другие факторы, которые делают еще более мрачной эту картину. Действительно, мы должны отметить некоторые новые явления. Одним из них, внушающим наибольшую тревогу, является насилие, направленное против журналистов со стороны торговцев наркотиками, мафии и других преступных организаций, а также групп, которые проповедуют экстремистские, основанные на нетерпимости политические или религиозные идеи. Мы также выражали сожаление в связи с тем, что некоторые правительства пытаются установить контроль над средствами информации, нанося таким образом ущерб плюрализму информации. В то же время мы с радостью видели, что огромные массы людей выходили на стихийные и мирные демонстрации протеста против подобного государственного контроля.

Без свободной печати демократия невозможна. Всякое отступление в области свободы печати является отступлением от самой демократии. В этот день, 3 мая 1997 года, я вновь подтверждаю приверженность ЮНЕСКО свободе и плюрализму средств информации во всем мире. Мы и в дальнейшем будем оказывать поддержку работникам средств массовой информации и делать все возможное, чтобы укрепить уважение к принципам свободы печати, на которых зиждется демократия. Вместе — в том числе с помощью и при поддержке государств — членов ЮНЕСКО — мы решим эту задачу.

Федерико МАЙОР,
Генеральный директор ЮНЕСКО.

Ідзе падпіска на другую палову 1997 года

Вы – з "Народнай воляй"!

Разгарнулася падпіска на другое паўгоддзе.

Спадзяёмся, што Вы заўжды будзеце з "Народнай воляй" — газетай, для якой галоўнае — гэта праўда жыцця, свабода слова, павага да правоў чалавека.

У [illegible] умовах выходзіць "Народная воля". Не [illegible] падпіска [illegible]. Каб штодзённа (акрамя святаў) [illegible], падпісчыкам трэба будзе заплаціць: на месяц — 29.000 рублёў, на тры месяцы — 87.000, на паўгода — 174.000 рублёў. Падпіска аб'яўлена да 15 чэрвеня. Наш індэкс: 63222.

Ведаем, у многіх цяжкае фінансавае становішча. А таму разлічваем на дабрачынных тых, у каго ёсць магчымасць дапамагчы бяднейшым. Галоўнае — каб кожны, хто хоча чытаць "Народную волю", меў такую магчымасць.

Рэдакцыя "Народнай волі".

Сенсация

Суд защитил честь и достоинство опального депутата Семена Домаша

Людмила МАСЛЮКОВА,
политический обозреватель "Народной воли"

Статья "Зигзаги Семена Домаша" была опубликована в "Народной газете" 17 декабря 1996 года. Автор ее назвался Александром Донским, а под этим псевдонимом скрывался обозреватель государственного пропрезидентского издания Юрий Дудинов. Главный смысл публикации не оставлял сомнений у читающего: журналист старательно, хотя далеко не профессионально, живописал в негативе своего героя — известного хозяйственника и бывшего председателя Гродненского облсовета, депутата и члена Президиума Верховного Совета 13-го созыва, оппозиционного политика и государственного деятеля.

"Разгромную" статью 24 декабря 1996 года перепечатала областная газета "Гродзенская праўда", и вряд ли по собственной инициативе. Уж очень это в духе доперестроечных времен, когда по команде сверху на инакомыслящего дружно обрушивалась вся "вертикаль" официальной прессы. Таким образом, и земляки Семена Домаша, и его избиратели, и родня, и коллеги получили возможность смаковать искаженные факты, недоказуемые предположения и необоснованные подозрения в изложении пресловутого "Александра Донского".

21 января суд Советского района города Минска принял от С.Н.Домаша иск о защите чести и достоинства к "Народной газете", "Гродзенскай праўдзе" и автору Юрию Дудинову. Истцу помогала в роли адвоката кандидат юридических наук Галина Осипова из Гродно. Дело приняла к рассмотрению судья Марина Федорова. Судебное расследование началось в открытом заседании 27 февраля, продолжилось 28 марта, длилось с 22 по 24 апреля. 29 апреля спор сторон суд первой инстанции разрешил в пользу истца. Ответчики процесс проиграли.

Как установлено теперь уже и судом, напрасно автор скандального опуса писал, "замазывая" героя, о "преступлении без наказания", пытаясь впутать бывшего руководителя области в старую громкую гродненскую криминальную историю о махинациях с цветными металлами. Зря вдохновенно строчил журналист строки, обличающие депутата в том, что он якобы обманывал своих избирателей, суля подвести газ в их дома. Ничего этого Семен Домаш не совершал, что и доказал суду. Человек этот — не преступник и не обманщик. Это его оболгали с подачи недобросовестного журналиста две массовые государственные газеты — республиканская и областная.

Суд обязал "Народную газету" и "Гродзенскую праўду" опровергнуть сведения, порочащие честь и достоинство политика и депутата Семена Домаша. С первого издания взыскивается в пользу невинно пострадавшего 10 миллионов рублей. Второе издание за перепечатку сомнительного "компромата" должно поплатиться 6 миллионами. Автор пасквиля Юрий Дудинов обязан выложить из собственного кошелька 2 миллиона рублей.

Ответчики, вероятно, не успокоятся на достигнутом и не согласятся с вердиктом. Пожалуй, рановато ставить точку в этой истории и наблюдателям. Ведь "расстрел" лидеров оппозиции с помощью монополизированных электронных и печатных СМИ широко применяется в Беларуси. Дело Домаша против Дудинова дает богатейший материал для анализа технологии лжи, подтасовок, шельмования честных граждан и обмана общественного мнения. К нему, несомненно, стоит вернуться и осмыслить произошедшее более глубоко и подробно.

Надо сказать, что до сих пор судебные политические процессы, в которых фигурировали опальные у власти деятели оппозиции, как правило, в подавляющем большинстве разрешались не в их пользу. Случай с Семеном Домашем — редчайшее исключение. Вот почему первые сведения о результатах рассмотрения рядового гражданского дела мы сообщаем как о сенсации. При ныне действующей "демократии по-белорусски" происшествие действительно почти невероятное, а также отрадное и отчасти даже обнадеживающее. Фемида не окончательно утратила мужество считаться с доказательствами и стоять на защите правды.

Возвращаясь к провокации

Стекла еще не вставлены. Личности установлены. Меру наказания определит суд...

В предыдущем номере "Народная воля" пообещала рассказать читателям о том, чем же закончился неприятный инцидент, происшедший на проспекте Ф.Скорины в самом начале "Чарнобыльскага шляха-97". Дозвонившись до следственной части Советского РОВД, наш корреспондент получил следующую информацию: личности всех четверых задержанных установлены. Уголовное дело по статье 201 (злостное хулиганство) возбуждено в отношении только одного из них, парня 1976 года рождения, имя и фамилию которого до решения суда следственные органы обнародовать отказались. Улик против остальных для милиции якобы оказалось недостаточно.

БНФ, чьи люди непосредственно участвовали в задержании хулиганов, предложил следствию свои услуги в предоставлении свидетельских показаний, на что последовал короткий и недвусмысленный ответ: "К вам обратимся только тогда, когда понадобится". Остается надеяться, что суд, призванный поставить точку в этой истории, показаниями очевидцев пренебрегать не станет и воздаст виновным по заслугам. Ну, а будут ли установлены истинные виновные, те, кто организовал и санкционировал эту акцию, — ответ на этот вопрос мы вряд ли когда-нибудь узнаем. Хотя знать об этом нужно уже теперь. Слишком опасные вещи происходят в нашем государстве.

Между тем, окна в студенческом общежитии №2 до сих пор "зияют" выбитыми стеклами. Жильцы этого здания в беседах между собой, несомненно, кого-то проклинают. Не исключено, что и дисциплинированных участников демонстрации. А ведь это явно не по их адресу!

Сергей ШАГОЛЬСКИЙ.

Пробка у моста...

28 апреля в 21.30 прекратилось движение транспорта по магистрали Москва — Брест в районе аэропорта "Минск-2". Магистрали, за проезд по которой водители транзитных машин, идущих из Западной Европы на Восток и в обратном направлении, платят деньги. И немалые.

Так почему же недалеко от Смолевич, там, где трасса пересекает дорогу, связывающую Минск с аэропортом, почти на час было остановлено движение через мост? Может быть, произошла авария? Может, пролеты рухнули?

Все, оказывается, прозаичнее. Заранее перекрыли движение по одной причине — под мостом на большой скорости должен был проследовать автомобиль президента А.Лукашенко, который возвращался из зарубежной командировки.

Вы можете посчитать убытки, которые понесла Беларусь от таких "мер безопасности"? Конечно же, счет идет на многие миллионы рублей. У дальнобойщиков строгий график, любое отклонение — это потери. А какие убытки понесли наши, белорусские, граждане электорат А.Лукашенко, которые стояли у моста и чертыхались на чем свет стоит?

Нет, в нашем государстве, как сказал классик, что-то не так... Никогда не будем богаты, если из-за одного человека теряются миллионы рублей...

Федор КЕРНОЖИЦКИЙ.
Минск.

Ну и ну!

Отблагодарили за... благотворительность

Белорусские власти требуют от Белорусского фонда Сороса уплаты 3 миллионов долларов

29 апреля с.г. произошло событие, которое является очередным шагом, направленным на расправу с Белорусским фондом Сороса. Фонду предъявлен акт проверки, подписанный главным государственным налоговым инспектором Государственного налогового комитета Республики Беларусь. Общая сумма штрафных санкций, которую, согласно этому документу, должен уплатить Белорусский фонд Сороса, приближается к трем миллионам долларов США.

Фонд обвинен в целом ряде нарушений, якобы допущенных в ходе его благотворительной деятельности, в том числе — в получении прибыли. Трудно сказать, как выглядят подобные обвинения с точки зрения законодательства, ибо таковое — регламентирующее деятельность благотворительных организаций — в Беларуси попросту отсутствует (видимо, поэтому при проверке фонда использовались те же критерии, которые применяются к коммерческим структурам).

А вот с точки зрения здравого смысла, упомянутые обвинения выглядят более чем абсурдно. Общественной организации, финансируемой частным лицом, предложено выплатить в пользу государства сумму, равную половине ее годового бюджета (в 1996 году Белорусский фонд Сороса потратил на реализацию различных программ около 6 млн. долларов).

Но разве не на пользу государству и его гражданам была направлена поддержка белорусских больниц и школ, молодежных организаций и детских садов, учебных заведений и библиотек, академических институтов и экологических организаций, музеев и театров, творческих союзов и исследовательских центров — поддержка, которая за четыре года существования фонда составила 13 млн. долларов?

Наверное, наиболее полно на этот вопрос может ответить Кабинет министров Республики Беларусь, издавший в 1995 году два постановления, которые обеспечили гранты Белорусского фонда Сараса безналоговым статусом. Но, как оказалось, даже документы такого уровня не смогли защитить фонд от штрафных санкций.

Белорусский фонд Сороса отвергает предъявленные ему обвинения и оставляет за собой право опротестовать основные положения акта проверки в отведенный для этого пятидневный срок.

Служба информации и общественных связей Белорусского фонда Сороса.

Радаўніца

Радаўніца — сталы засцілаць, дзядоў памінаць...

Ушанаванне памяці продкаўнябожчыкаў — арганічная і неад'емная частка нашага жыцця — жыцця жывых. Услед за Вялікаднём — самым значным веснавым народным святам — прыходзіць Дзень памінання памерлых, своеасаблівы Вялікдзень нябожчыкаў — *Радаўніца* (Радуніца; Радуніцкія Дзяды; Провады; Праводны дзень).

Радаўніца займае важнае месца ў велікоднай абраднасці і адзначаецца ў аўторак так званага *Фамінога тыдня* — наступнага пасля Велікоднага. Такая прымеркаванасць свята вельмі сімвалічная: жывыя памінаюць памерлых на **дзевяты** дзень пасля дня Уваскрэсення Хрыста.

Раніцой гэтага дня гаспадыня наведвае царкву, ставіць свечку за спачын душы памерлых родзічаў, заказвае малебен. Апоўдні ўсе члены сям'і, святочна апранутыя, накіроўваюцца на могілкі, дзе і адбываецца памінальны абрад. (Напярэдадні, у панядзелак, неабходна старанна прывесці ў парадак магілу — абкласці новым дзёрнам, пасадзіць кветкі, паправіць крыж.)

Белы льняны абрус, прынесены з дому, рассцілаецца прама на насыпе, на яго ставяцца разнастайныя стравы: рытуальныя — велікодныя яйкі, свянцоная соль, куцця з запаленай свечкай, кавалкі пасвечанай "паскі", і звычайныя — каўбаса, бліны, сала, хлеб, сыр, масла ды інш. Пакрыху кожнай з гэтых страў адкладваюць у першую чаргу для нябожчыка, каб тым самым засведчыць сваю памяць і павагу да яго. Калі памерлы любіў пры жыцці выпіць, яму на магілу можна пляснуць гарэлкі, калі меў звычку курыць — пасыпаць трохі тытуню.

Гаспадар, падняўшы чарку з гарэлкай, звяртаецца з заклікам да *"радзіцеляў"* (так называюць усіх памерлых):

Святыя радзіцелі,
Што ад нас паляцелі,
Хадзіце к нам,
Будзем есці, што Бог даў!

Ядуць і гавораць доўга. Добрым словам успамінаюць родных і блізкіх, якіх ужо няма побач. Абавязковы абрад "хрыстосавання" з памерлым, які заключаецца ў качанні крыж-накрыж па магіле чырвонага велікоднага яйка.

Памінальны абрад скрозь прасякнуты галашэннямі. У першую чаргу гэта датычыцца сем'яў, якія смерць наведала нядаўна. Аснову галашэнняў складаюць рытарычныя пытанніствароты да памерлых бацькі ці маці, сына ці дачкі, брата ці сястры, іншых сваякоў. Вось урывак галашэння, звернутага да бацькі:

А мой жа ты татулечка,
А мой жа ты зязюлечка!
А каму ж ты нас пакінуў?
А хто ж нас будзе адзяваці?
Хто ж нас будзе карміці?
Каму ж ты пакінуў сваю сошаньку?
А каму ж пакінуў сваю ніваньку?..

Галосяць звычайна пажылыя жанчыны. Але не толькі. Сірата ці нявестка, напрыклад, галосячы, могуць смела паскардзіцца нябожчыку на тых, хто іх крыўдзіць.

Рэшткі ежы, што засталіся пасля памінальнага абраду, звычайна аддаюць жабракам, якія потым у сваіх малітвах памянуць нябожчыка. На магіле ж пакідаюць толькі велікоднае яйка — тое, якім "хрыстосаваліся" з памерлым. Развітваючыся, жадаюць нябожчыку, каб зямля была для яго лёгкая.

Памінанне продкаў на могілках праходзіць спакойна, задуменна, павольна. Паступова пад вечар сумны настрой развейваецца. Працяг святкавання адбываецца дома і суправаджаецца шумным застоллем, песнямі і нават скокамі. Але не трэба расцэньваць гэта як блюзнерства ў адрас нябожчыкаў. Такі фінал Радаўніцы перш за ўсё сведчыць аб старадаўнасці памінальных абрадаў, нагадвае нам пра часы, калі абавязковымі заключнымі элементамі пахавальнага рытуалу былі смех, жарты, весялосць. Такім чынам нашы продкі імкнуліся пераадолець страх перад цялеснай смерцю, фізічным небыццём. Пры гэтым неабходна памятаць, што смерць уяўлялася нашым далёкім родзічам як заканамерны пераход у іншы свет — свет духоўнай бессмяротнасці. Таму могілкі павінны ўспрымацца не проста як месца пахавання продкаў, а ў першую чаргу як месца сустрэчы з гасцямі свету вечнасці.

Уся адметнасць і незвычайнасць памінальнага дня Радаўніцы адлюстраваліся ў народнай прыказцы: "На Радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а вечарам скачуць".

Падрыхтавала Кацярына ГУТКОЎСКАЯ.

Да ўвагі чытачоў!
У сувязі са святамі наступны нумар "Народнай волі", як і іншых газет, выйдзе 8 мая.

За чашкой кофе с Мариной КОКТЫШ

Владимир ЯНКОВСКИЙ:

"Мог ли я когда-нибудь предполагать, что буду снимать клипы для МТV?"

Рекламные и музыкальные ролики ворвались в нашу жизнь, как в семидесятые годы — космос. И уже невозможно представить ежедневный TV-эфир без творчества клипмейкеров, предлагающих нам СВОЕ видение самых разнообразных проявлений этого мира. И уже фактически в их власти — каким мы будем воспринимать этот мир. Примитивным, агрессивным, пошлым или ... красивым.

Самый красивый (в прямом и переносном смысле) белорусский клипмейкер Владимир Янковский сегодня за чашечкой кофе делится своим восприятием мира.

— Володя, что сегодня нужно для того, чтобы снять клип или рекламный ролик?

— Лично мне для этого нужны деньги. А в принципе, наверное, талант, умение найти заказ...

— За деньги Вы можете сделать все?

— Нет. Я никогда не буду снимать пошлость или халтуру. Даже за очень большую сумму. Я стараюсь выполнять свою работу на достаточно высоком уровне. Может, поэтому у меня сейчас очень много заказов из-за рубежа.

— Некоторые режиссеры и клипмейкеры не стеснялись поправлять свое материальное положение рекламой финансовых пирамид с известным началом и не менее известным концом. Вы могли бы согласиться на подобные предложения?

— Я ни разу не делал и, думаю, не буду делать рекламных роликов типа АО "МММ". Более того, я всегда относился к такому "творчеству" с отвращением. Это изначально подло и фальшиво. Как плохой театр.

— Многим запомнился просто роскошный российский рекламный сериал банка "Империал". Есть ли в Беларуси учреждения, личности или явления, которым бы Вы с радостью посвятили свой рекламный сериал?

— Не так давно я с большим удовольствием снял рекламу минской водки. Правда, это была реклама не водки (ее рекламировать запрещено), а торговой марки. С помощью компьютера мы восстановили картину старого Минска. Получился красивый ностальгический ролик. Недавно закончил работу над серией рекламных роликов для швейцарской парфюмерно-косметической фирмы "Свис формула". Вообще, я люблю работать с иностранцами. С ними можно профессионально и в то же время спокойно творить.

— Клипмейкерство — достаточно новая область в кинотворчестве, особенно у нас в стране. Каков в ней, на Ваш взгляд, процент брака?

— О музыкальных роликах говорить сложно. 50 процентов успеха тут все-таки зависит от музыки и исполнителя. Правда, в нашей стране хороших исполнителей очень мало. И зачастую клипы бывают интереснее самих песенных произведений. А если говорить о рекламе, то тут брак зависит только от суммы. Когда заказчик не очень богат и предлагает минимальную сумму, я, естественно, не могу сделать приличный ролик. Потому как не смогу его снять на качественной пленке, не в состоянии пригласить дорогую модель, талантливого оператора и так далее. Все качественное стоит денег.

— Но где их взять в нищей Беларуси?

— Действительно, многие, увидев, что бизнес в Беларуси фактически прижали к ногтю, стали снимать дешевые ролики. И в этом их ошибка. Не может быть ролик красивым, если отсутствует профессиональный свет. Это будет обычный бытовой ролик. Как у любого оператора-любителя. Так могут все. Я так снимать не могу. И поэтому в плане сметы ролика всегда придерживался определенной планки. И никогда не опускался ниже.

— Некоторые представители белорусской музыкальной тусовки утверждают, что нынешним молодым исполнителям катастрофически не хватает раскрутки, в частности, клипов, рекламы. Согласны ли вы с таким утверждением? Если да, то кому бы Вы при определенных условиях готовы сделать раскрутку?

— Я пытался участвовать в раскрутке "Рублевой зоны". Мы хотели делать ролик, но он так и не состоялся. Мне нравится "Мегаполис". Вообще, я очень люблю хорошую музыку и мне сложно об этом говорить.

— А какой именно музыке Вы отдаете предпочтение?

— Я принимаю любое направление в музыке. Я не сноб и не могу быть верен только одному музыкальному течению. В каждом музыкальном стиле есть невероятно тонкие и талантливые вещи. Однако, по большому счету, самое интересное направление для меня — это хард-рок 70-х годов.

— Володя, сейчас Вы находитесь на таком уровне, что вполне могли бы работать на зарубежном рынке. У Вас не возникало желания перебраться, скажем, в Москву и найти свою нишу там?

— В Москву меня приглашали еще два года назад, на "Premier-SV". Но я не хочу там жить. Я не люблю Москву. Меня раздражает тамошняя тусовка, раздражает много шума из ничего, московская фанаберия. У меня здесь есть отличная команда ребят. И бросить все вот так вдруг было бы просто безумием. Еще мне предлагают поехать в Германию. Но я не знаю, что и как будет дальше. Пока меня все устраивает так, как есть.

— То есть Вас можно назвать патриотом своей республики?

— Скорее, патриотом своего дела. Я родился в Минске и настолько привык ко всему здешнему, что порой его ненавижу. А бывает, в отъезде, иногда тоскую по родине. Наверное, я люблю эту страну...

— В таком случае, Вам не хочется продолжить работу над социальной рекламой на какую-нибудь животрепещущую тему?

— Я сейчас очень хочу снять за свои деньги ролик о восстановлении храмов. Мне кажется, в нашем обществе не хватает духовности и возвышенности. Может быть, посмотрев ролики о церквях, кто-то станет добрее...

(Окончание на 2-й стр.)

Народная Воля

3 МАЯ 1997 г.

Задумайцеся...

Васіль БЫКАЎ

Што можа чакаць беларускі народ ад ідэалагічных імпатэнтаў...

Штатныя прэзідэнцкія прапагандысты сапсавалі тоны паперы, агітуючы народ (а можа, болей сябе) за аб'яднанне. Уся іх агітацыя, аднак, не пасоўваецца далей звыклых стэрэатыпаў накшталт "З бяды трэба выбірацца разам", "Жыць разам лепей, чым паасобку", "Вялікае славянскае брацтва", "Непарушны саюз" і г.д. Што і казаць, стэрэатыпы хлёсткія і хвацкія, але ўсё ж цяжка адкараскацца ад крамольнае думкі, што ўсё тое **было.** І навек вялікае брацтва, і непарушны саюз. І чым скончылася, усім вядома. Прытым без вайны, крывавых катастроф, без ракетных удараў і нават дэманстрацыі бронетэхнікі. (Крывавыя дэманстрацыі адбыліся пазней, ад іх і дагэтуль смуродзяць чэчэнскія руіны.) Узяло і развалілася, як сведчаць людзі, пасля трох выпітых чарак. На працягу паўгадзіны. На лясным лецішчы ў Белавежскай пушчы.

А цяпер вось колькі ўжо год вялізнымі высілкамі апантаных інтэгратараў, высакалобых палітолагаў, масы актывістаў ды патрыётаў усіх колераў і адценняў цяжка зляпіць хоць колькі-небудзь прыстойны альянс двух славянскіх, "в доску братских" народаў. У чым тут справа? Чаму не склейваецца?

Ды вельмі проста — змянілася структура абедзвюх палавін, іхні хімічны склад зрабіўся несумяшчальным. І ўсё таму, што ў новай гістарычнай рэальнасці аслабела традыцыйнае клеявое рэчыва — **страх.** Народы, якія на працягу дзесяцігоддзяў стагналі пад ярмом таталітарызму, пры першым зручным выпадку інстынктыўна рванулiся прэч, яшчэ не ўяўляючы, што іх чакае на волі. Чакала, як аказалася, не шмат радасці: адсутнічаў патрэбны вопыт, што, зрэшты, само па сабе не смяртэльна. Але не было ідэалаў (калі не лічыць за ідэал танную каўбасу), здольных кансалідаваць нацыю, натхніць яе на складаную і страхавітую барацьбу за будучыню. Людзі прадаўжалі жыць трудным сённяшнім днём, змагаючыся не за ідэі — за кавалак хлеба ды бутэльку гарэлкі. Адраджэнскія ідэі БНФ, беззаганныя ў сваёй аснове, не сталі агульнанацыянальным здабыткам, не захапілі масы, а хіба што паслужылі ім у нацыянальна-асветніцкіх мэтах. Зноў жа вельмі хутка высветлілася, што і аб'ядноўваць, па сутнасці, няма каго, адсутнічаў аб'ект для аб'яднання. За папярэднія дзесяцігоддзі высілкамі партыі ды КДБ нацыя і без таго ператварылася ў бяспраўную, маўклівую масу саўкоў, з якое пануючая сіла ляпіла, што хацела. Для надання ёй нейкага нацыянальнага падабенства недастаткова было прапагандысцкіх высілак БНФ, патрабавалася псіхалагічная перабудова, рашучае абуджэнне ад векавога сну. Але тое вымагала часу, а часу якраз і не было. Гэтым і пакарысталіся камуністычныя сілы, якія хуценька акрыялі пасля вядомага пасляпутчаўскага спалоху і дружна рынулі ў наступ. На ідэалагічным полі ім, бадай, нішто не супрацьстаяла. Некалі папулярная ў Беларусі нацыянал-дэмакратычная ідэя, як аказалася, болей палохала, чым вабіла, у народзе жыў даўні ўедлівы страх рэпрэсіяў за нацыяналізм. Іншыя ж ідэі, пераважна ліберальна-індывідуалісцкага кшталту, мала прываблівалі ўжо хоць бы з прычыны іх надта нянаскага, "заморскага" паходжання і не знаходзілі глебы для ўкаранення.

Між тым існаваў пераканаўчы прыклад палітычнай культуры блізкага Захаду, выпрацаваны ў выніку няпростага гістарычнага існавання ў выглядзе ўніверсальных каштоўнасцяў-імператываў: Рынку, Дэмакратыі, Правоў чалавека. Суверэннага існавання, нарэшце. Чаму б не запазычыць іх, калі не хапіла розуму ці здольнасцяў стварыць лепшыя?

Дык жа не, не прышчэпліваецца ў нас амаль нічога лепшага з таго, без чаго не абыходзіцца Захад. Ды і ўвесь свет таксама. Быццам спрадвечны залом заламаны на ніве народа, чыя свядомасць гэтак збэшчана векавой дэспатыяй. Што мы за людзі, калі і дагэтуль "што сказаць самім сабе і людзям не ведаем, не можам, хоць і час" (Я.Купала)? Што нас чакае ў любым альянсе, апроч бясследнага растварэння, непазбежнай асіміляцыі ў болей палітычным, пасіянарным асяродку? У сэнсе матэрыяльным могуць прадбачыцца пэўныя "выгоды" (усё ж энерганосьбіты, гандлёвая прастора), але ж столькі стагоддзяў еўрапейскай гісторыі, старажытная культура, нарэшце, дзівосная крынічная мова... І ўсё насмарку, на паступовае, марнае знікненне...

На цвярозы розум, дык перш чым уступіць у які-небудзь, хай сабе самы выгодны саюз, кожны народ павінен прайсці свой, гістарычна прызначаны адрэзак шляху, перарасці хібы шматгадовага зла, выкараніць у сабе раба, накапіць патрэбны маральны набытак, пазнаць калі не практыку, дык хоць бы патрэбу ў раўнапраўным дэмакратычным існаванні. У саюзе часу на тое не будзе, як можа, не будзе і патрэбы. Аб'яднанне павінна разглядацца як стратэгічная **мэта,** а не які-небудзь спекулятыўны сродак, паратоўчае выйсце з авантурнай палітыкі. Менавіта пра тое сведчыць палітычны вопыт Еўропы XX стагоддзя, здабыты з практыкі найперш яе нацыянал-дэмакратызму. Сацыял-дэмакратызму таксама.

Ужо стала відавочна, што Беларусь забрыла ў тупік, у нерат, з якога немаведама як і куды выбірацца. Салодкія размовы аб "шматвектарнасці, збалансаванасці" яе знешняй палітыкі скончыліся на справе глухой ізаляцыяй з Захаду ды катастрафічнай пагрозай з Усходу. Мабыць, тут справа не ў дыпламатычных высілках, патрэбна гарантыя правоў чалавека, імкненне да сапраўды адкрытага грамадства. Што ж тычыцца Усходу, дык астранамічная запазычанасць за энерганосьбіты падкладвае пад стасункі з Расіяй жахлівую міну замаруджанага дзеяння. Як бы ні шчыравала наша кіраўніцтва, але ягоная сервільная палітыка ды антынатаўская рыторыка наўрад ці задаволяць "Газпрам" ды "Лукойл", мабыць, рана ці позна яны прыбяруць да сваіх лапаў усе ласыя кавалкі беларускай эканомікі. З чым тады застанецца "суверэнны" прэзідэнт? Хіба што з суверэнным АМАПАМ.

Праблема, аднак, яшчэ і ў тым, што Расія і Беларусь, як паказвае практыка, рухаюцца не толькі з рознымі хуткасцямі, але, падобна, і ў розных накірунках, кожная будучы ўпэўненая, што рухаецца правільна. У такіх абставінах дзіўна слухаць зладжаны хор пра аб'яднанне. Галоўны беларускі інтэгратар даўно ўжо прывучыў нас да дзівосных парадоксаў сваёй палітыкі, але як зразумець ягоную шараду пра тое, што Беларусь і Расія стануць адным цэлым і пры тым кожная ані трошкі не саступіць свае незалежнасці. Па ўсёй верагоднасці, мудрасць задумы палягае ў тым, што Беларусь ў дзяржаўных адносінах цалкам інтэгруецца з Расіяй, у той час як яе прэзідэнт застанецца ранейшым дыктатарам-суверэнам. Надта складаная задума, трэба зазначыць, як бы Лукашэнка ў сваім адмысловым хітраванстве не перахітрыў самога сябе.

Людзям жа з нармальнай логікай, як расійцам, так і беларусам, трэба зразумець, што ўся гэта мітусня з аб'яднаннем — не болей чым палітычная імітацыя ідэалагічных імпатэнтаў, шумавы фіглярскі эфект з мэтай адцягнення ўвагі народаў ад несумненнага факта **банкруцтва ідэі дэмакратызацыі,** падмены яе банальнай практыкай таталітарызму. Гэта апошняя сапраўды аб'ядноўвае спаяным адзінствам заўжды з'яднаных сістэм-монстраў, якімі з'яўляюцца вядомыя карпарацыі, ВПК, КДБ-ФСБ, войска, традыцыйная імперская ксенафобія і гэткая ж традыцыйная камуна-ідэалогія. Падобна на тое, што непасільную для Расіі дэмакратычную ідэю вырашана канчаткова нейтралізаваць ультраантыдэмакратычнай беларускай прышчэпкай, каб пасля скончыць з дэмакратыяй на ўсёй постсавецкай прасторы. Бо на што ж яшчэ можна разлічваць, ужываючы такую ін'екцыю, якая складаецца з грымучай сумесі эканамічнага калапса і палітычнага камуна-фашызму?

Галоўнае — не грошы, а іх колькасць...

Па сярэднямесячнаму ўзроўню зарплаты сярод галін народнай гаспадаркі рэспублікі за першы квартал, як сведчыць статыстыка, па-ранейшаму лідзіравала банкаўская сфера. Яе супрацоўнікі ў сярэднім атрымлівалі па 3 мільёны 99 тысяч рублёў. Параўнальна высокія паказчыкі за гэты перыяд таксама ў авіятараў — 2 мільёны 643 тысячы рублёў і ў супрацоўнікаў судовых і юрыдычных установаў — 2 мільёны 637 тысяч. Больш за два мільёны сярэднямесячная зарплата яшчэ толькі ў сферы матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння і збыту і ў апараце органаў дзяржаўнага кіравання.

Рост зарплаты ў працэнтных адносінах да адпаведнага перыяду мінулага года адзначаны ў прамысловасці — 173,4 працэнта, гандлі і грамадскім харчаванні — 171, будаўніцтве — 162,7, у галіне мастацтва — 165,6, у галіне аховы здароўя — 161,3, адукацыі — 164,1, сацыяльнага забеспячэння — 169,1 працэнта.

Самай нізкай па-ранейшаму застаецца сярэднямесячная зарплата ў работнікаў сельскай гаспадаркі — 835 тысяч рублёў, сацыяльнага забеспячэння — 1018,4, культуры — 1304,3, мастацтва — 1257,8 тысячы рублёў.

Таццяна СМІРНОВА, БелТА.

"Мог ли я когда-нибудь предполагать, что буду снимать клипы для MTV?"

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

— Вам никогда не предлагали участвовать в рекламной поддержке какого-нибудь политического деятеля?

— Я всегда был диссидентом. Еще во времена брежневского застоя. Не любил коммунистов категорически. Как, впрочем, и сейчас. В политику не лезу принципиально. Я отказываюсь от участия в рекламных политических акциях. Меня не интересует политика. Не интересует спорт. Но интересует искусство, живопись.

— Совеременная реклама в большинстве своем далека от возвышенного. И порой предполагает определенное навязывание ходовых или залежалых товаров. Интересно, Вы сами пользуетесь той продукцией, которую рекламируете?

— Косметикой, которую я рекламирую, пользуется моя жена.

— У Вас есть любимые ролики?

— Из своих мне очень нравится "Шизофрения". Своей любимой рекламной работы нет — думаю, она еще впереди. Из мировых примеров я в восторге от рекламы водки "Смирнофф": когда через бутылку водки все преображается. Музыкальных клипов очень много хороших... Наверное, больше всех мне нравится "Белив" Элтона Джона. К сожалению, я не знаю режиссера.

— Что вы ненавидете рекламировать?

— Абсолютно "левые", нереальные вещи. Мне нравится работать с косметикой. И я, к слову, снимал рекламу белорусских парфюмерно-косметических фирм. Но эти ролики крутят не у нас, а за рубежом. Приятно, конечно, работать с красивыми моделями, с красивой продукцией, с романтическими темами. Но мне в то же время совершенно все равно, что рекламировать: вафли, кефир или ботинки. Всегда можно найти какую-то оригинально красивую идею.

— Вы работали со многими известными людьми. От работы с кем у Вас остался неприятный осадок, а от кого — приятные воспоминания?

— С кем не понравилось работать, говорить не буду. Я-то человек прямой, и люди могут обидеться. Не секрет, что на съемочных площадках и истерики, и скандалы случаются. Больше всего понравилось работать с немцами. Это был пример настоящего творческого единомышления. Они полностью отдали себя мне на растерзание. И я делал все, что хотел. Я был раскрепощен. Они не ставили мне никаких условий. Такая атмосфера деловых взаимоотношений меня наиболее устраивает и настраивает на оптимальный результат.

— Вы часто ходите в театр?

— Нет. В Минске, на мой взгляд, в последнее время не было крупных событий в театральной жизни. Несколько раз, правда, папа приглашал на свои спектакли. И в Москве иногда хожу. Но, мне кажется, с театром сегодня что-то случилось. Он стал скучным. Я считаю, что мне крупно повезло: в своей жизни я видел спектакли таких режиссеров, как Эфрос, Любимов, Васильев, Струа, Некрошес.

— Вы себя считаете светским львом?

— Нет. Я вообще ненавижу светские тусовки. В Беларуси им просто неоткуда взяться, а московские меня дико раздражают. Да это и не тусовки вовсе, а фарс.

— Многих волнует проблема взаимоотношений Янковских. Как оценивают Вашу работу Олег, Игорь?

— Игорь раньше осторожно смотрел на мое творчество. Теперь ему нравится. А Олега я не видел года полтора. Работы много, некогда.

— О чем Вы мечтаете?

— Мечтаю снять кино. Правда, пока нет достойного сценария. Меня не прельщает снимать кино просто так, чтобы его потом забросили на полку или никто не увидел. Кинопроката у нас просто нет, поэтому я планирую сделать фестивальный фильм. Я хочу, чтобы обо мне заговорили. А для этого нужен десяточный сценарий.

— И что потом?

— Хотелось бы, конечно, подержать в руках статуэточку Оскара, но это все фантазии, сон. Хотя, кто знает... Мог ли я когда-то предполагать, что буду снимать клипы для MTV?

Міхась ПАРАХНЕВІЧ

Споведзь

Светлай памяці майго сябра пісьменніка Міколы Корзуна

Не жыву — існую,
Не жыву — выжываю,
Муліць хрусткія косці
Тапчана труна.
Колькі дзён тых яшчэ —
Бог адзін толькі знае,
Бог — адзіны суддзя,
Калі лопне струна.

Нахадзіўся, напёр
Па кастрычніцкім свеце,
Горы гумы стаптаў
На брусчатках дарог.
Пах камунны п'яніў,
Як вясновая квецень,
Толькі ў рай той камунны
Патрапіць не змог.

Цугам перлі туды
Усіх масцей фарысеі,
За партрэты, сцягі
Прыхаваўшы зады.
Ну, а нам, працяўкам,
Пакідалі ідэі —
Быць падручнымі партыі
Усюды, заўжды.

Тых ідэй накаўтаўся,
Як бусел вужакаў,
Калі сонца прысмаліць
У лесе лаўжы.
Доля выпала мне
Усіх зямных небаракаў —
Упірацца мацней,
Больш нацягваць гужы.

Ды ў часіны крамлёўскіх,
Здзічэлых харалаў,
Калі праўда з няпраўдай
Расхіствалі трон,
Маё сэрца усё ж
Не рабіла прывалаў,
